Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынга

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за люты 2013 г.

## Мерапрыемствы да Дня роднай мовы

15 лютага Гадзіна роднай мовы "Далучыся да роднага слова". Мерапрыемства прайшло ў форме віктарыны.

Лелікаўская СБ, 15 чал.

19 лютага Гадзіна развагаў "Каб не забрудзіць ні душу, ні вусны". На мерапрыемстве прысутнічалі вучні 7 класа Залескай школы. Абмеркоўваліся пытанні рэальнага выкарыстоўвання беларускай мовы, праблемы моўнага этыкету ў сучасным грамадстве, наяўнасць брыдкаслоўя. Рэклама навінак беларускага друку.

Залеская СБ, 32 чал.

20 лютага Выступленне ЛПГ «Ритм» «Мелодыя роднага слова». У праграме:
- літаратурная кампазіцыя "Гучная, звонкая, матчына мова",
- прэзентацыя вершаў члена раённага літаратурнага аб'яднання "Белый аист" Наталлі Цярэнцьевай.

Цэнтральная бібліятэка,72 чал.

27 лютага Гадзіна роднай мовы "Родная мова – крыніца празрыстая". Размова ішла аб прыказках, прымаўках, загадках. Гучалі вершы сучасных беларускіх паэтаў.

Верхалеская СБ, 19 чал.

## Мерапрыемствы да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл РБ і да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў

15 лютага Урок мужнасці "В грозном зареве афганской войны" прайшоў з удзелам воінаў-інтэрнацыяналістаў Соўпеля С.М., Азарчука Ю.І., Леанюка П.В.. З "дэмбельскіх альбомаў"былых салдат была афармлена фотапаліца "Место службы – Афган".

Аніскавіцкая СБ, 21 чал.

22 лютага Рыцарскі турнір «О воинстве, о доблести, о славе» прайшоў у форме віктарыны па гісторыі ўзброеных сіл Рэспубдікі Беларусь.

Стрыгаўская СБ, 23 чал.

23 лютага Фотавыстава "Праз гады службы" да Дня абаронцаў Айчыны. На выставе прадстаўлены фотаальбомы былых салдат, адслужыўшых тэрміновую ваенную службу ў радах узброеных сіл.

Буховічская СБ

23 лютага Наведванне вытворчага ўчастка "Вілія-агра". Выступленне ЛПГ "Раніца" з літаратурна-музычнай кампазіцыяй "Людзям з зоркай устаючым". На мерапрыемстве з уступным віншавальным словам выступіў кіраўнік гаспадаркі Новік В.В.

Балоцкая СБ, 25 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

3 лютага Гадзіна-сустрэча з цікавымі часопісамі "Путешествие в журнал-город".

Восаўская СБ, 15 чал.

9 лютага Гадзіна гісторыі "Ён быў заўжды з народам " да 95 годдзя з дня нараджэння П. Машэрава. Прысутным прадстаўлена сайд-шоу фотадакументаў аб жыцці, палітычнай дзейнасці, партызанскім руху і аб укладдзе ў развіццё індустрыі рэспублікі П.Машэрава.

Лукская СБ, 23 чал.

9 лютага Літаратурны партрэт “Хроніка аднаго жыцця” (да 120-годдзя з дня нараджэння М.Гарэцкага).

Бібліятэка пас. Птушкафабрыка, 20 чал.

10 лютага Інфармацыйная гадзіна “Першы беларускі класік” (да 205-годдзя з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча).

Дзівінская ДБ, 34 чал.

13 лютага Экскурс-падарожжа “Твой друг – библиотека” адбыўся для выхаванцаў дзіцячага садка №13. Дзяцей пазнаёмілі з магчымасцямі дзіцячай бібліятэкі. Адбылося выступленне лялечнага спектакля «Сказочная карусель», дзеці адказалі на пытанні віктарыны па казках.

Дзіцячая бібліятэка, 18 чал.

14 лютага На выніковай нарадзе культработнікаў раёна была прадстаўлена выстава выданняў, распрацаваных супрацоўнікамі ЦРБ, куды ўвайшлі краязнаўчыя, сцэнарныя, метадычныя матэрыялы, рэкамендацыйныя спісы, бібліяграфічныя паказальнікі, альбомы з вопыту работы і г.д. .Выстава будзе пастаянна дзейнічаць у цэнтральнай бібліятэцы і кожны жадаючы можа яе наведаць ці ў бібліятэцы, або на сайце РЦБС.

*(Кобрынскі веснік, 2013.-23.02.- С.4)*

14 лютага Для супрацоўнікаў культуры горада і раёна была падрыхтавана відэапрэзентацыя “Інфарматызацыя бібліятэк Кобрынскай РЦБС: вынікі і перспектывы”, дзе ў нагляднай форме былі прадэманстраваны магчымасці цэнтральнай бібліятэкі і бібліятэк аграгарадкоў.

22 лютага Урачысты вечар “Нашы лепшыя чытачы 2012”. Да мерапрыемства падрыхтавана медыавіктарына аб літаратурных героях і гумарыстычная хвілінка “Легко ли быть библиотекарем”. Лепшыя чытачы былі адзначаны дыпломамі ў 13 намінацыях.

Дзівінская СБ, 45 чал.

24 лютага Пасяджэнне аматарскага клуба “Сонейка” прайшло ў форме мультымедыа-гутаркі “Изучать, знать и охранять”. Да мерапрыемства падрыхтавана віктарына аб птушках Беларусі. Сумесна, удзельнікі пасяджэння наведалі сайт «Ахова птушак Бацькаўшчыны», пазнаёміліся з птушкай 2013 года-удодам.

Арэхаўская СБ, 17 чал.

24 лютага Пасяджэнне клуба “Крыніца” “Весеннее пробуждение”. Да мерапрыемства падрыхтавана кніжная выстава “Каждое семя знает своё время”. Вопытам апрацоўкі насення да сяўбы на расаду падзялілася знакаміты агароднік вёскі Валошына В.М. “Рыхтуем грунт да севу гароднiны”- такую кансультацыю прысутным дала Лысачукова М.К. Удзельнікі пасяджэння дзяліліся насеннем кветак і гароднiны. Усё гэта адбылося за традыцыйным чаяваннем.

Гарадзецкая СБ, 34 чал.

**<u>Выдавецкая дзейнасць</u>**

Бібліяграфічны паказальнік “Літаратура аб Кобрыне і Кобрынскім раёне за 2012 год”

Цэнтральная бібліятэка, бібліёграфы

Электронны бібліяграфічны паказальнік “Каляндар знакамітых і памятных дат Кобрыншчыны на 2013 год”

Цэнтральная бібліятэка, бібліёграфы

Дырэктар Кобрынскай ЦБС М.В. Іванова

Падрыхтавала: гал. бібліятэкар
аддзела бібліятэчнага маркетынга І.А.Іванова 2-36-81